Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па
справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама

Установа культуры «Гродзенскі дзяржаўны
гісторыка-археалагічны музей»

pawet.net

# КРАЯЗНАЎЧЫЯ ЗАПІСКІ

Заснаваны ў 1990 годзе

Выпуск 9

Гродна
2013

УДК 908(476.6)(082)
ББК 63.3(4Беи)
К78

Друкуецца па рашэнні Навукова-метадычнай рады
УК «Гродзенскі дзяржаўны
гісторыка-археалагічны музей»

Рэдакцыйная калегія:
*Р.В. Янчалоўская* (галоўны рэдактар)
*К.В. Галота, А.А. Данілевіч, В.М. Царук,*

К78 Дзявяты выпуск зборніка склалі навуковыя артыкулы, якія прысвечаны асобам і падзеям часоў праўлення караля польскага і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя, яго гродзенскай рэзідэнцыі.

**ISBN 978-985-99335-8-5**

©УК ГДГАМ., 2013
©Афармленне.
ТАА «ЮрСаПрынт», 2013

# ЗМЕСТ

**Кітурка Ю.В.** Верхні замак і Барысаглебская царква на гравюры М. Цюндта «Сапраўдны выгляд горада Гродна» 1568 года ........ 5

**Волкаў М.А.** Аб некаторых аспектах архітэктуры Старога замка ў Горадні часоў Стэфана Баторыя ........ 16

**Бочков В.В.** Королевская резиденция на Замковой горе ........ 21

**Трусаў А.А.** Гродзенская кафля з палаца Стэфана Баторыя ........ 36

**Семянчук Г.М.** Гарадзенскія замкі ў 1578 годзе ........ 44

**Карев Д.В., Литвинский А.В.** Стефан Баторий и его эпоха в историографической традиции западнорусизма (конец XIX–начало XX в.в.) ........ 63

**Шаланда А.І.** Набілітацыя Стэфанам Баторыем гарадзенскі кухараў у 1581 г. ........ 86

**Юргенсон В.А.** Монеты Стефана Батория как средство политической пропаганды и репрезентации власти ........ 96

**Калясінскі В.Ф.** Манеты і медалі часоў Стэфана Баторыя (1576–1586) як важны іканаграфічны матэрыял ........ 104

**Мілінкевіч І.З.** Калізіі ўвядзення новага календара Стэфанам Баторыем ........ 107

**Развановіч А.С.** Бібліятэка Гродзенскага езуіцкага калегіума (па матэрыялах калекцыі аддзела рэдкіх кніг і стрададрукаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея) ........ 114

**Казак Т.В.** Ушанаванне памяці Стэфана Баторыя
ў Гродне ў міжваенны час ........................................................ 124

**Пачобут Н.А.** Археалагічныя даследаванні замка Кміты
ў 2013 годзе ............................................................................ 132

**Глінскі Я.С.** Радавод князёў Алелькавічаў Слуцкіх
у гістарычных творах эпохі Стэфана Баторыя ........................ 142

72.03(476)

**М.А. Волкаў**
**г. Мінск**

# Аб некаторых аспектах архітэктуры Старога замка ў Горадні часоў Стэфана Баторыя

Перабудова Старога замка ў Горадні, ініцыяваная Стэфанам Баторыем у апошняй чвэрці XVI ст., стала адным з найбольш значных этапаў у яго гісторыі. Сярэднявечны абарончы замак, збудаваны пры Вітаўце, саступіў месца шыкоўнай рэнесанснай рэзідэнцыі, ад якой да цяперашняга часу ў перабудаваным стане захаваўся палац. У гэтым невялікім артыкуле мы звернем увагу на некаторыя аспекты архітэктуры рэзідэнцыі Стэфана Баторыя.

Перш чым перайсці да характарыстыкі рэнесанснай рэзідэнцыі, варта коратка спыніцца на апісанні сярэднявечнага замка. Гэта дазволіць зразумець характар змен, што адбыліся з замкам у апошняй чвэрці XVI ст. Ад сярэднявечнага замка да трэцяй чвэрці XVI ст., як можна меркаваць па гравюры М. Цюндта 1568 г. і інвентары 1578 г. [1, S. 56–57], захаваліся вежа з боку горада, круглая вежа-бергфрыд, рэшткі якой, верагодна, трэба шукаць на месцы сучаснай брамы, вежа-брама, якую, як нам падаецца, трэба атаясамліваць з рэшткамі вежы над Нёманам, і т.зв. вежа «ад Нёмана», якую, на нашу думку, трэба атаясамліваць з вежападобным будынкам, што стаяў на т.зв. «каземаце», ці падвале часоў Вітаўта. Сцяна на захад за вежай «ад Нёмана» да гэтага часу разбурылася ці была разабрана з-за падмыву Замкавай гары плынню ракі.

Прычына занядбання ўмацаванняў замка палягала ў аддаленасці Горадні ад галоўных тэатраў ваенных дзеянняў Вялікага Княства Літоўскага. Замак, што будаваўся для абароны ад крыжацкай агрэсіі, фактычна страціў сваё значэнне пасля разгрому Нямецкага ордэна ў Вялікай (1409–1411 гг.) і Трынаццацігадовай войнах (1454–1466 гг.) і ўключэння Прусіі ў сферу ўплыву Польшчы. Менавіта таму мы не знаходзім Гарадзенскага замка ў спісе ўмацаванняў, што цягам 1551–

1565-х гг. забяспечваліся зброяй з віленскага арсенала [2, S. 281–302]. Інакш кажучы, у Горадню, што ў гэты час не адыгрывала істотнай ролі ў сістэме абароны ВКЛ, не была выслана ніводная гармата, гакаўніца ці ручніца.

На месцы сярэднявечнага замка пры Стэфане Баторыі была ўзведзена ўжо не абарончая, а «адкрытая» рэзідэнцыя. Як можна меркаваць па плане 1655 г., на заходнім рагу Замкавай гары так і не была адноўлена абарончая сцяна [3]. У сваю чаргу інвентар 1653 г. не згадвае аб баявых галерэях па перыметры абарончай сцяны замка, апроч перабудаванай галерэі, што вяла ад палаца да брамы і лазні [4, С. 8–9]. Аднак гэтая галерэя выкарыстоўвалася не для абароны, а для камунікацыі між згаданымі будынкамі. Пры гэтым варта адзначыць, што новая рэнесансная рэзідэнцыя атрымала некалькі элементаў абарончага ўмацавання: брама з пад'ёмным мастом. Аднак абарончыя элементы рэнесанснага замка ў Горадні былі ўяўнымі і адпавядалі архітэктурна-мастацкай канцэпцыі тагачасных рэзідэнцый. Адасобленасць замка-рэзідэнцыі ад горада, якая ўзмацнялася наяўнасцю рова, пад'ёмнага моста і брамы, сімвалізавала сацыяльную дыстанцыю паміж сюзерэнам і падданымі, што было характэрна для саслоўнага грамадства [5, S. 46–47]. Такім чынам, замак Стэфана Баторыя не быў абарончым аб'ектам, здольным супрацьстаяць моцнай палявой арміі. Выкарыстоўваць для абароны яго можна было хіба ў выпадку лакальных канфліктаў і закалотаў. Абарончы патэнцыял быў вернуты замку ў час вайны 1654–1667 гг., калі Горадню заняло маскоўскае войска. Шляхам узвядзення дадатковых драўляных умацаванняў замак быў ператвораны акупацыйным войскам у цытадэль, што панавала над горадам [6, С. 55].

Паводле інвентара 1653 г., у замку не было цэйхгаўза, ці арсенала, а таксама ўзбраення і рыштунку для вядзення доўгачасовай абароны. У інвентары згадваецца толькі пра 6 вялікіх гармат і больш за 900 мушкетаў, аднак гэта вельмі нетыповы для тагачаснай фартэцыі набор зброі. У Гарадзенскім замку не было, напрыклад, ніводнай гакаўніцы, што прызначаліся найперш для абароны ўмацаванняў [4, С. 12]. Таму, на нашу думку, узбраенне, пра якое паведамляе інвентар 1653 г., прызначалася

для забеспячэння палявога войска. У сваю чаргу перабудаваны Гарадзенскі замак з канца XVI ст. выкарыстоўваўся як база для забеспячэння ўзбраеннем наёмнага войска, што вербавалася ў землях ВКЛ ці ў сумежных рэгіёнах Прусіі і Польшчы.

Пры перабудове Гарадзенскага замка пад «адкрытую» рэзідэнцыю архітэктар здолеў выкарыстаць значную частку збудаванняў папярэдняга абарончага комплексу, што тлумачылася найперш імкненнем да эканоміі рэсурсаў. Была перабудавана і цалкам змяніла свае функцыі вежа-брама сярэднявечнага замка. На другім паверсе гэтай вежы была зроблена лазня, а на трэцім – алебастравая (пазней мармуровая) зала. Для зручнасці камунікацыі між паверхамі да вежы з усходу была прыбудавана квадратная ў плане лесвічная клетка, падмурак якой быў выяўлены ў міжваенны перыяд. На гравюры Т. Макоўскага пачатку XVII ст. бачна, што вежа на «каземаце», або вежападобны палац гатычнага замка, была перабудавана ў рэнесансным стылі і ўключана ў склад новага рэзідэнцыяльнага комплексу. Аднак да сярэдзіны XVII ст. гэты будынак з-за падмыву Замкавай гары Нёманам быў разабраны, аб чым згадваецца ў інвентары 1653 г. [4, С. 4]. Па пісьмовых і іканаграфічных крыніцах добра бачна, як рака паступова знішчала Замкавую гару і сам замак: да сярэдзіны XVI ст. абвалілася сцяна на заходнім рагу дзядзінца, у першай палове XVII ст. знікла вежа на «каземаце», у другой палове XVII ст. была разабрана частка сцяны далей на ўсход, а ўжо ў XIX ст. абрынулася вежа-брама гатычнага замка.

Побач з вежай на «каземаце», ці палацам гатычнага замка, у апошняй чвэрці XVI ст. быў збудаваны даволі вялікі аднапавярховы будынак. Большасць даследчыкаў лічыла, што гэты будынак быў узведзены ў другой палове XVII ст. для размяшчэння пасольскай ізбы сойма [7, S. 140], аднак, на нашу думку, яго будаўніцтва варта адносіць менавіта да часу будаўніцтва рэзідэнцыі Стэфана Баторыя. Па-першае, вільчык даху гэтага будынка бачны на гравюры Т. Макоўскага. Па-другое, ён выразна бачны на плане 1655 г. І ўрэшце, па-трэцяе, датаванне яго падмуркаў даволі спрэчнае, напрыклад, М. Варонін датаваў іх даволі шырока – XVI–XVII стст. [8, С. 18].

Баявая галерэя на паўднёвым адцінку абарончай сцяны замка Вітаўта была перабудавана пад калідор для камунікацыі паміж будынкамі новага рэзідэнцыяльнага комплексу. Яна злучыла рэнесансны палац з новай вежай-брамай, узведзенай, верагодна, на месцы гатычнага бергфрыда. Далей галерэя ішла да лазні ў колішняй браме гатычнага замка, а за ёй – да вежы на «каземаце». Аб спосабе перабудовы гэтай галерэі можна меркаваць на падставе параўнання яе выявы на гравюрах М. Цюндта і Т. Макоўскага. Баявая галерэя замка Вітаўта мела зубцы, у сярэдзіне якіх, па ўсёй верагоднасці, былі вузкія шчыліны, што выкарыстоўваліся для назірання. У сваю чаргу, для стральбы з лукаў і арбалетаў выкарыстоўваліся шырокія байніцы між зубцамі. Падобная баявая галерэя, з зубцамі са шчылінамі ўнутры, мелася, напрыклад, на сценах Віцебскага замка, збудаванага пры Альгердзе. У час перабудовы Гарадзенскага замка ў апошняй чвэрці XVI ст. на месцы шырокіх байніц між зубцамі і назіральных шчылін у зубцах былі выкладзены прыкладна аднолькавыя байніцы. Таму на гравюры М. Цюндта на сцяне, справа ад вежы-брамы, бачны 6 байніц між зубцамі, злева – 4, а на гравюры Т. Макоўскага справа ад перабудаванай пад лазню колішняй вежы-брамы бачны ўжо 12 вузкіх байніц, а злева – 9. Падобным чынам, па ўсёй верагоднасці, была перабудавана і баявая галерэя ў Лідскім замку.

Такім чынам, рэзідэнцыя Стэфана Баторыя, збудаваная на месцы сярэднявечнага абарончага замка, ужо не мела абарончага характару, хаця і выкарыстоўвалася для захоўвання ўзбраення для палявога войска. Наяўнасць некаторых абарончых элементаў у яе архітэктуры стварала ілюзію цытадэлі, што было характэрна для рэзідэнцый таго часу. Пры гэтым новую рэзідэнцыю не сталі будаваць па ўсім перыметры былога гатычнага замка. Будынкі абарончага і жылога прызначэння сярэднявечнага замка, акрамя хіба вежы-бергфрыда, былі перабудаваны і ўключаны ў склад новай рэнесанснай рэзідэнцыі.